Источник: "Настаўніцкая газета" - 2017-06-01

## Уладзіміру КОШАЛЕВУ — 70

# Адзін з лідараў гістарычнай навукі Беларусі



Гэтага чалавека ў нашай рэспубліцы называюць па-рознаму: арабіст, эрудыт, унікальны гісторык, стваральнік навуковай школы, той, хто рыхтуе дактароў навук. Так, у нашай краіне ёсць дзясяткі і нават сотні таленавітых гісторыкаў. Чым жа адрозніваецца ад іх доктар гістарычных навук прафесар Уладзімір Кошалеў?

Уладзімір Сяргеевіч — адзін з самых таленавітых вучоных-гісторыкаў нашай краіны, адзін з лідараў гістарычнай навукі Беларусі па многіх паказчыках. Гэта гісторык, які, акрамя англійскай, нямецкай і французскай моў, выдатна ведае арабскую. Ён чэмпіён па падрыхтоўцы кандыдатаў і дактароў гістарычных навук сярод выкладчыкаў ВНУ Рэспублікі Беларусь. Падумаць толькі! Прафесар Уладзімір Кошалеў — навуковы кіраўнік 34 кандыдацкіх дысертацый і навуковы консультант 8 доктарскіх дысертацый.

У.С.Кошалеў — самы вядомы і самы аўтарытэтны беларускі гісторык-усходазнавец. За год і два месяцы замест належных двух гадоў скончыў Інстытут усходніх моў пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М.В.Ламаносава. Ён праходзіў усходазнаўчую падрыхтоўку ў Інстытуце ўсходніх моў пры МДУ (1968—1970) і ў Каірскім універсітэце (1971—1972), стажыраваўся ў Джорджтаўнскім універсітэце (ЗША, 1995).

Ён першы лаўрэат прэміі БДУ ў галіне гуманітарных навук імя першага рэктара БДУ выдатнага гісторыка-славіста Уладзіміра Іванавіча Пічэты.

У.С.Кошалеў стаяў ля вытокаў стварэння ВАК нашай краіны, а ў 2009—2016 гадах быў членам прэзідэума ВАК Рэспублікі Беларусь.

Вось ужо 28 гадоў Уладзімір Сяргеевіч узначальвае адну з вядучых кафедраў гістарычнага факультэта БДУ — кафедру новай і найноўшай гісторыі. Да таго ж ён "чэмпіён" сярод галоўных рэдактараў і аўтараў падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў для сярэдняй школы на рускай і беларускай мовах. Іх у яго каля 60 агульным тыражом каля дзесяці мільёнаў.

Незвычайны лёс Уладзіміра Сяргеевіча. У 16 гадоў ён скончыў сярэднюю школу і ў 1963 годзе паступіў на першы курс гістарычнага факультэта БДУ. Уладзімір Сяргеевіч да гэтага часу не можа забыць, што кіраўніком яго курсавой работы на першым курсе быў дацэнт Давід Барысавіч Мельцэр, які стаў вядомым беларускім вучоным-славістам.

У час навучання Уладзімір Кошалеў стаў любімым студэнтам сусветна вядомага вучонага, гісторыка, прафесара Мікалая Паўлавіча Палецікі, які быў навуковым кіраўніком яго курсавых і дыпломнай работы. Ён падарыў Уладзіміру арабска-рускі слоўнік, які яму вельмі спатрэбіўся.

На ўсё жыццё запомніў Уладзімір Сяргеевіч лекцыі прафесара Льва Міхайлавіча Шнеерсана, які стаяў ля вытокаў яго навуковай кар'еры, парады навуковага кіраўніка сваёй кандыдацкай дысертацыі "Унутрыпалітычная барацьба ў Егіпце ў гады Другой сусветнай вайны (1939—1942)", выдатнага савецкага ўсходазнаўца доктара гістарычных навук Роберта Рыгоравіча Ланда, сустрэчу з вядомым расійскім усходазнаўцам Апалонам Барысавічам Давідсанам.

Больш за 200 навуковых работ У.С.Кошалева прысвечаны праблемам сусветнай гісторыі, у тым ліку гісторыі Егіпта і іншых краін Арабскага Усходу, новага і найноўшага часу, у тым ліку праблемам эвалюцыі традыцыйнага грамадства, генезісу партыйнай сістэмы, дзейнасці мусульманскіх нацыяналістычных арганізацый. Найбольш буйнымі з іх з'яўляюцца "Егіпет да Эль-Аламейна — з гісторыі ўнутрыпалітычнай барацьбы" (Мн., 1977), "Егіпет: урокі гісторыі. Барацьба супраць каланіяльнага панавання і контррэвалюцыі (1879—1981)" (Мн., 1984); "Егіпет ад Арабі-пашы да Саалда Заглула. 1879—1924" (М., 1992).

Вялікі рэзананс атрымалі манаграфія "Гісторыя Еўропы: з вопыту інтэграцыйных працэсаў", напісаная Уладзімірам Сяргеевічам у суаўтарстве з К.М.Бандарэнкам і П.Р.Лук'янавым і выдадзеная ў Магілёве ў 2010 годзе, яго артыкулы "Да пытання пра эвалюцыю ідэі прагрэсу" (1993), "Крызіс сучаснай цывілізацыі і гістарычная навука" (2001), "Якасць гуманітарнай адукацыі" (2007). "Другая сусветная і Вялікая Айчынная войны ў беларускіх школьных падручніках" (М., 2010).

У адным з выступленняў на навуковай канферэнцыі патрыярх беларускай гістарычнай навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Георгій Васільевіч Штыхаў высока ацаніў артыкул У.С.Кошалева "Гістарычная перыядызацыя" ў трэцім томе "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (Мн., 1996).

Пра навуковы аўтарытэт прафесара Уладзіміра Кошалева сведчыць той факт, што ён быў членам рэдкалегіі "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" (у 6 тамах) і "Беларускай энцыклапедыі" (у 18 тамах), старшынёй (1995—1997) і намеснікам старшыні (1997—2004) савета па абароне доктарскіх дысертацый пры Беларускім дзяржаўным універсітэце, членам савета па абароне доктарскіх дысертацый пры Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, з'яўляецца шматгадовым членам савета па абароне доктарскіх дысертацый пры БДУ, рэдкалегій і рэдакцыйных саветаў часопісаў "Беларускі гістарычны часопіс", "Гісторыя: праблемы выкладання", "Вышэйшая школа".

Гаворачы пра навуковую школу Уладзіміра Сяргеевіча, варта заўважыць, што больш за ўсё ён ганарыцца тым, што 8 дактароў гістарычных навук, у якіх ён быў навуковым кансультантам, з'яўляюцца гордасцю не толькі беларускай, але і еўрапейскай гістарычнай навукі: Вячаслаў Іванавіч Мянькоўскі, Рыгор Рыгорывіч Лазько, Аксана Васільеўна Пятроўская, Іван Васільевіч Варывончык, Людміла Мікалаеўна Сямёнава, Вольга Барысаўна Келер, Канстанцін Міхайлавіч Бандарэнка, Мікалай Мікалаевіч Мязга.

Аўтару гэтых радкоў удалося сустрэцца з некаторымі студэнтамі, якія слухалі лекцыі У.С.Кошалева. Адны называюць яго хадзячай энцыклапедыяй, другія — галавой, трэція — клёвым мужыком. Адчуваецца, што Уладзімір Сяргеевіч быў і застаецца для іх аўтарытэтам.

Мне неаднаразова прыходзілася быць сведкам кансультацый Уладзіміра Сяргеевіча для сваіх аспірантаў і саіскальнікаў. Запомнілася, што ён не "душыў" нікога сваім аўтарытэтам, а стараўся ўпэўніць іх у мэтазгоднасці і праўдзівасці той ці іншай высновы або тэарэтычнага палажэння.

Трэба адзначыць, што прафесар У.С.Кошалеў не толькі талковы і адказны навуковы кіраўнік, але і такі ж адказны эксперт і апанент пры абароне каля 20 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Уладзімір Сяргеевіч узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, нагрудным знакам "Выдатнік адукацыі", ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Хочацца пажадаць юбіляру моцнага здароўя і новых творчых поспехаў.

**Эмануіл ІОФЕ,**
**прафесар**
**Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка,**
**доктар гістарычных навук.**

Эмануіл Іофе. Адзін з лідараў гістарычнай навукі Беларусі